**В.Д.Старычонак**

# СЕМАНТЫЧНЫЯ МАДЭЛІ Ў СФЕРЫ ДРУГАСНЫХ НАМІНАЦЫЙ

У сучасных лінгвістычных даследаваннях другасных намінацый увага акцэнтуецца на выяўленні сістэмнасці ўтварэння ЛСВ, рэгулярнасці метафарычных пераасэнсаванняў, спосабах рэалізацыі семантычных мадэлей у розных відах дыскурса. Шматлікія пытанні семантычнага мадэлявання, звязаныя з катэгорыямі рэгулярнасці і прадуктыўнасці, разглядаюцца ў многіх навуковых працах [Баранов 1991; Желтухина 2000; Кабаченко 2007; Кобозева 2000, 2001; Кубрякова 1999; Кузьмина 1999; Кукса 2007; Лабутина 1998; Минский 1979; Павлович 1995; Падучева 2004б; Петров 1990; Прокопьева 2006; Рахилина 1998, 2000; Рябых 2006; Скребцова 2000; Степаненко 2001; Толстая 2002; Феденева 1997; Чудинов 2000]. Мадэляванне як метад пазнання і структурнай характарыстыкі аб'екта ў канцы XX ст. аформілася ў самастойны навуковы кірунак – тэорыю мадэлявання рэчаіснасці [Баранов 1991, 2014; Кубрякова 1999, Рахилина 2000; Чудинов 2000, 2001, 2003].

Любая мадэль, штучна створаная лінгвістамі на аснове гіпотэзы аб магчымай будове арыгінала, будуецца на ўніверсальных семантычных законах і прадугледжвае выкарыстанне абстракцыі і ідэалізацыі; гэта «не толькі матэрыяльна-фізічная, але і абстрактная (наглядна-вобразная) рэпрэзентацыя пэўных уласцівасцей і фрагментаў мадэлюемага прататыпа» [Баранов 1994, с. 19]. Па словах А.П.Чудзінава, мадэль з'яўляецца адлюстраваннем існуючай схемы ці схемы, што складваецца ў свядомасці носьбітаў мовы, паміж рознымі паняційнымі сферам [Чудинов 2003а, с. 64].

Для абазначэння відаў мадэлей даследчыкі выкарыстоўваюць розныя тэрміны ў залежнасці ад акцэнтавання ўвагі на уласна-лінгвістычным, агульнафіласофскім, псіхалагічным ці кагнітыўным аспектах. Так, Д.М.Шмялёў (1964, 1973), Ю.Д. Апрэсян (1971) выкарыстоўваюць тэрмін мадэль рэгулярнай мнагазначнасці, Г.М. Скляроўская (1993) – тэрмін метафарычнае поле. На думку Н.А. Ілюхінай (2010), з мадэллю суадносіцца кагнітыўная па сваёй прыродзе катэгорыя вобраза, якая ў праекцыі на лексічны ўзровень мовы прадстаўлена асацыятыўна-семантычным полем як сукупнасцю розных парадыгмаў. У працах Дж. Лакоффа і М.Джонсона (1987, 1988, 1990) падобным да семантычнай мадэлі можна лічыць тэрмін структурная метафара.

Звычайна пад мадэллю разумеецца пэўная канцэптуальная вобласць, элементы і структурныя часткі якой звязаны паміж сабой рознымі адносінамі, рэгулярна і паслядоўна ўзнаўляюцца. Такая вобласць выступае ў ролі максімальна абстрагаванай, абагуленай схемы (узору) для семантычнага структуравання і асэнсавання іншай паняційнай вобласці. Мадэль – гэта кагнітыўны аналаг рэальных сувязей сутнасцей аб'ектыўнага свету, іх узаемадзеянняў і залежнасцей, гэта «схема фарміравання метафарычнага значэння, якая характарызуецца адзінствам тэматычнай суаднесенасці намінатыўных і пераносных метафарычных значэнняў» [Резанова 2010, с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

37]. Прамое намінатыўнае і метафарычнае значэнні выступаюць у мадэлі як своеасаблівыя прызмы, якія факусіруюць сэнсы ў цэласных семантыках суадносных адзінак і рэпрэзентаваных імі кагнітыўных структурах [Резанова 2012, с. 39]. Схема сувязей паміж паняційнага сферамі, як правіла, будуецца па формуле «X – гэта Y» («X падобны да Y»).

У аснову семантычных мадэлей часцей за ўсё кладуцца бінарныя апазіцыі (інтэгральныя семы першасных і другасных ЛСВ), якія звязваюцца паміж сабой на ўзроўні featureнага роду асацыяцый, падабенстваў, параўнанняў, атаясамліванняў і стэрэатыпных уяўленняў. Мадэль пры дапамозе сцэнарыяў, фрэймаў і слотаў, якія адносяцца да розных паняційным сфер, з’яўляецца сродкам спасціжэння, прадстаўлення і ацэнкі фрагментаў рэчаіснасці, у якіх адлюстроўваецца нацыянальная, сацыяльная і асобасная самасвядомасць [Чудинов 2001, с. 48].

Семантычная мадэль, нягледзячы на здавалася б, яе ўстойлівасць, пастаянства анталагічных прымет і нязменлівасць, характарызуюцца дынамічнасцю і здольнасцю да мадыфікацый і абнаўленняў, што абумоўлена рознымі прычынамі моўнага і экстралінгвістычнага характару. Выкарыстанне мадэлі дае магчымасць будаваць здагадкі на аснове некаторых вядомых агульных прымет, а ўтвораныя па гэтых мадэлях другасныя намінацыі спрыяюць развіццю навуковай думкі, у найбольшай ступені прадуцыруюць веды і з’яўляюцца інструментамі пазнання [Опарина 1988, с. 68].

У працэсе канструявання семантычнай мадэлі ўлічваюць наступныя структурныя элементы:

1. Зыходная паняційная сфера (у другіх тэрмінах – вобласць-крыніца, кагнітыўны крыніца, сфера-крыніца, крыніца матывацыі, поле-крыніца, сфера-донар, фрэйм-крыніца, крыніца метафарычнай экспансіі, зона адпраўлення, вобласць дамена, канал атрымання інфармацыі, літаральная рамка, тое, што атаясамліваецца, асацыіруецца або параўноўваецца). Да гэтай сферы адносяцца першасныя неметафарычныя ЛСВ. У многіх выпадках можа актуалізавацца не толькі зыходная паняційная вобласць, але і яе асобныя ўчасткі, якія паслужылі крыніцай метафарычнай экспансіі. Сэнсавая напоўненасць першасных значэнняў, іх тэматычная накіраванасць шмат у чым вызначаюць семантычныя шляхі і сцэнарыі развіцця семантычнай дэрывацыі, даюць магчымасць прагназаваць эвалюцыю значэння слова. Таму ў шэрагу выпадкаў семантычна падобныя зыходныя ЛСВ утвараюць прыкладна аднолькавыя па семантыцы другасныя ЛСВ.

2. Выніковая (новая) паняційная сфера (у другіх тэрмінах – вобласць-мэта, новая канцэптуальная вобласць, дзейсная паняційная сфера, сфера-рэцыпіент, сфера-магніт, сфера-мішэнь, фрэйм мэты, поле-мэта, вынік метафарычнай экспансіі, тое, з чым адбываецца атаясамліванне, параўнанне). Да гэтай сферы адносяцца другасныя ЛСВ, якія адлюстроўваюць практычна ўсю аб’ектыўную рэальнасць праз люстэрка метафар. Пры метафарычнай праекцыі ў сферы-магніце захоўваюцца не толькі сэнсавыя кампаненты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зыходнай сферы, але і яе канататыўны патэнцыял, які стварае вялікія магчымасці для ўтварэння эмацыянальна-ацэначных ЛСВ.

3. Семантычныя кампаненты (інтэгральныя семемы), якія злучаюць першасныя і другасныя ЛСВ, указваюць, на якіх падставах зыходная паняційная сфера выкарыстоўваецца для абазначэння элементаў выніковай сферы. Напрыклад, у зоамарфічнай метафарычнай мадэлі падставай для ўтварэння другасных ЛСВ з'яўляецца тое, што ў людзей і жывёл выяўляюцца агульныя семантычныя прыметы. Агульнасць аналогій семантычных пераасэнсаванняў назіраецца ў параметрычных (велічыня, памер, вышыня, глыбіня, даўжыня, рост, форма), часовых (узрост, час, працягласць), гукавых (гучнасць, тэмбр), тэмпературных (гарачыня, холад), каларатыўных (колер, свет), тактыльных (цвёрдасць, мяккасць), адарычных (пах) і многіх іншых намінацыях.

Такія семантычныя мадэлі складаюць адну з асноўных частак нацыянальнай моўнай карціны, нацыянальнай ментальнасці, у адпаведнасці з якой чалавек дзейнічае, думае, знаходзіць аналогіі і ўніверсальныя сувязі паміж прадметамі і з'явамі рэальнасці, пэўным чынам класіфікуе навакольную рэчаіснасць [Старычонак 2007, с. 20]. Таму ўтварэнне другасных намінацый часта ўкладваецца ў межы тыпалагічных і ўніверсальных мадэлей тыпу «жывёла → чалавек», «чалавек → чалавек», «частка цела жывёл і чалавечага арганізма → разнастайныя прадметы, канструкцыі, дэталі і механізмы», «частка → цэлае», «род → від» і інш.

Пры гэтым неабходна ўлічваць той факт, што пры ўтварэнні другасных ЛСВ могуць актуалізавацца розныя падабенствы, аналогіі, асацыятыўныя сувязі і вобразныя ўяўленні, якія дазваляюць замацоўваць за зыходнай і выніковай сферамі адначасова некалькі розных сувязей, ад найменш стабільных, індывідуальна-аўтарскіх і творчых да ўстойлівых, зафіксаваных у культурнай традыцыі грамадства[ Баранов, 2003, с. 77].

Характарыстыка семантычных мадэлей у першую чаргу залежыць ад іх рэгулярнасці і прадуктыўнасці. Рэгулярнасць звычайна звязваюць са здольнасцю да разгортванняў у межах тыпавых для дадзенай мадэлі сцэнарыяў, паслядоўных сітуацый і канцэптуальных вектараў. Так, метафарычныя пераасэнсаванні лічацца менш рэгулярнымі, чым метанімічныя, па прычыне таго, што метафарычныя ЛСВ выконваюць намінатыўна-характарызуючую функцыю, у той час як метанімічным ЛСВ уласціва толькі функцыя наймення. На рэгулярнасць семантычных мадэлей істотна ўплываюць парадыгматычныя, сінанімічныя, антанімічныя, гіперанімічныя і іншыя адносіны паміж ЛСВ. Пад прадуктыўнасцю (паводле існуючай традыцыі) разумеецца квантытатыўная характарыстыка мадэлі, колькасць утвораных па ёй семантычных дэрыватаў. Ступень прадуктыўнасці залежыць ад шырыні разгортвання семантычнай мадэлі і колькасці ўключаных у яе дзеянне слоў адной і той жа ці некалькіх тэматычных груп.

У многіх даследаваннях у структуры семантычнай мадэлі вылучаюцца фрэймы (англ. *frame* 'рамка, каркас'), якія лічацца сукупнасцю пэўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чынам структураваных дадзеных (тэрміналаў), што служаць для рэпрэзентацыі стэрэатыпных канцэптаў [Минский 1979, с. 41], Фрэйм – гэта стандартызаванае аб’яднанне элементаў ведаў, спосабаў апісання і тлумачэння матэрыялу, «звязаны з сацыякультурным працэсам блок канцэптуальнай інфармацыі» [Глебкин 2014, с. 129]. Фрэймавы падыход – гэта адзін з найбольш эфектыўных спосабаў схематызацыі чалавечых ведаў, спосаб вывучэння структуры ведаў і прынцыпаў іх арганізацыі ў моўнай сістэме, гэта «пакет» ведаў пра тую ці іншую маўленчую сітуацыю, у якую «пагружана» тое ці іншае слова. Пэўныя веды ў фрэймах прадстаўлены ў тыпізаваных сітуацыях з акрэсленымі іерархічнымі структурамі, у якіх назіраецца канвенцыяльны пачатак і магчымасць дынамікі [Гусельникова 2009, с. 31]. Фрэйм акрэслівае сістэму сувязей слова, яго сітуацыйны кантэкст, вызначае акружэнне, пэўную рамку, па-за якой немагчыма адэкватнае разуменне слова ці сказа [Fillmore 1976, c. 25–28; Fillmore 1985, c. 223–224].

У нашым даследаванні фрэйм – гэта структурызацыя зыходнай і выніковай паняційных сфер, групоўка лексічных адзінак вакол якога-небудзь родавага паняцця, у якім утрымліваюцца звесткі пра відавыя лексічныя адзінкі і іх сэнсавыя структуры (гл., напрыклад, зоаморфічны, лакатыўны, саматычны, тэмпаральны і іншыя фрэймы). Фрэймавая семантыка дазваляе прадставіць семантыку зыходных і вытворных лексічных адзінак у поўным іх аб’ёме, прадэманстраваць не толькі каркас мадэлі, але і працэс стварэння такой мадэлі. Дзякуючы фрэймам лёгка выяўляецца дэнататыўная разнастайнасць (сярэдняя суаднесенасць колькасці дэнататыўных дэскрыптараў і частаты рэалізацыі гэтых дэскрыптараў у межах семантычнай мадэлі), дэнататыўная стабільнасць (рэгулярнасць выкарыстаных другасных намінацый у адносінах да пэўных дэнататаў і іх колькасці), частотнасць словаўжывання мадэлі (колькасць адпаведных мадэлей у адносінах да агульнай колькасці мадэлей, зафіксаваных у корпусе другасных ЛСВ), разгалінаванасць мадэлі (наяўнасць некалькіх сэнсавых цэнтраў з рознымі відамі суаднесенасці ЛСВ) і інш. Сістэма фрэймаў можа ўтвараць дынамічныя сцэнарыі, у якіх адлюстроўваюцца ўяўленні пра тыповую паслядоўнасць разгортвання мадэлі і яе асобных частак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ